УДК 271-055.2

# ДЗЕЙНАСЦЬ КАНГРЭГАЦЫІ СЯСЦЁР НЕПАКАЛЯНАК НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XX ст.

**Аўсейчык Юлія Аляксандраўна**
Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік
(г. Полацк, Беларусь)

*У артыкуле разглядаецца адукацыйная, апостальская і місіянерская дзейнасць жаночай манаскай рымска-каталіцкай супольнасці – Кангрэгацыі Сясцёр Безаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі (сясцёр непакалянак).*

Кангрэгацыя Сясцёр Безаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі (непакалянкі) была створана ў асяроддзі польскіх эмігрантаў у Рыме ў сярэдзіне XIX ст. Яе заснавальніцамі лічацца Юзэфа Карская і Марцэліна Дароўская [6, с. 47]. У наступным сёстры перабраліся ў Язловец (у сучасны перыяд тэрыторыя Украіны), а адтуль распаўсюдзілі сваю дзейнасць у іншыя рэгіёны Еўропы, у тым ліку і на беларускія землі [7, с. 55-56].

Асаблівасцю дзейнасці кангрэгацыі Марцэліна Дароўская бачыла ў адпаведным ўсебаковым развіцці жанчыны. Яна пакінула вучэбным установам сясцёр непакалянак арыгінальную сістэму навучання і выхавання. Мэту сваёй манаскай супольнасці яна вызначыла як «выхаванне будучых маці роду чалавечага» [6, с. 49].

Сёстры непакалянкі прыбылі на тэрыторыю Беларусі яшчэ ў 1907 г. Па звестках Л. Міхайлік, у Слонім непакалянак запрасіў мясцовы каталіцкі святар Рышард Клямм, яшчэ ў 1905 г. Але перш чым пагадзіцца на пераезд, М. Дароўская прасіла парады ў гэтай справе самаго папу Пія X [5, с. 63]. Спачатку кангрэгацыя развівалася і дзейнічала толькі ў Слоніме, але з ўваходжаннем Заходняй Беларусі у склад Польшчы, колькасці пляцовак павялічылася.

У часы Першай сусветнай вайны на тэрыторыі слонімскага кляштара быў разгорнуты шпіталь, у якім разам з медыцынскім персаналам працавалі непакалянкі [5, с. 65]. У Слоніме законніцы стварылі спачатку прыватную шасцікласную жаночую агульнаадукацыйную школу, а потым у 1919 г. заснавалі жаночую семінарыю імя М. Дароўскай, якая ў 1937 г. набыла статус навучальнай установы з правамі агульнаадукацыйнай дзяржаўнай гімназіі. У ёй, апроч рэлігіі, вывучалі нямецкую і французскую мовы, маляванне, працоўнае навучанне, прыродазнаўства, геаграфію, фізіку, хімію, біялогію, методыку педагагічнай падрыхтоўкі, гігіену, польскую мову і польскую гісторыю і інш. Выкладчыкамі працавалі адзінаццаць сясцёр непакалянак [1, с. 146]. За стварэнне семінарыі і навучанне дзяцей, настаяцельніца Тадэя Касцюшка з рук прэзідэнта Польшчы атрымала Сярэбраны Крыж Заслугі [3].

З архіўных матэрыялаў вынікае, што ў 1936 г. кляштар у Слоніме налічваў 20 непакалянак. Настаяцельніцай на той момант была Здзіслава Бельке. У дакументах таксама ёсць упамінанні дзвюх законніц Ады Дабжыньскай і Натанаэлы Рэўкоўскай, хутчэй за ўсё яны былі настаўніцамі ў дадзеных навучальных установах. Згодна з архіўнымі матэрыяламі, яны мелі вялікі ўплыў сярод бацькоў жаночай гімназіі і пачатковай школы. Слонімскі кляштар знаходзіўся ў маёнтку Рышчыц, які меў тэрыторыю ў 60 га [9, s. 491].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Кляштар у Валожыне ў 1936 г. налічваў 4 законніцы. Яны займаліся апостальскай працай сярод бедных дзяцей мясцовага насельніцтва. Сёстры выкладалі рэлігію ў пачатковых школах [9, s. 491].

Як вынікае з архіўных матэрыялаў, супольнасць непакалянак распачала сваю працу ў Глыбокім у 1936 г. [9, s. 514 ]. Па іншых жа звестках, ужо 21 жніўня 1934 г. законніцы былі ў гэтым горадзе. Спачатку ў Глыбокае прыехала с. Юзафіна і с. Анеля, а ў наступным годзе – с. Тадэя Касцюшка ў якасці настаяцельніцы [2]. Па звестках В.У. Герасімчыка, с. Тадэя Касцюшка (у свецкім жыцці – Марыя Касцюшка) прыбыла на беларускія землі яшчэ ў пачатку XX ст., некаторы час выконвала функцыі настаяцельніцы ў Слонімскім кляштары непакалянак [1, с. 145].

Архіўныя дадзеныя сведчаць аб невялікай колькасці законніц у Глыбокім. Так, на 1936 г. тут было іх толькі 5 чалавек. Сёстры займаліся выкладаннем у трохгадовай кравецка-белізнярскай школы пад кіраўніцтвам с. Тадэі Касцюшка. Крыніцы таксама сведчаць аб тым, што пры школе таксама былі курсы для падрыхтоўкі дзяўчат [9, s. 514]. Школа распачала сваё навучанне 1 кастрычніка 1935 г. і прыняла адразу 32 вучаніцы. Трэба адзначыць, што дзяўчаты адносіліся да розных канфесій (так, з усёй колькасці 14 вучаніц былі праваслаўнымі). Пры школе дзейнічаў інтэрнат, пабудаваны непакалянкамі. Установа адукацыі неаднаразова атрымлівала пахвалу ад Дома Рамёстваў у Вільні, і нават ад прэм’ер-міністра Польшчы Феліцыяна Славоя-Складкоўскага [3]. Але, у сваю чаргу, А. Станкевіч, дзейнасць непакалянак у Глыбокім ацэньваў па-іншаму: «у Глыбокім кс. З. трымае польскіх законьніц і яны бел(арускіх) кат(аліцкіх) дзяцей вучаць па-польску рэлігіі і польскай мовы» [8, с. 853 ].

Ужо пасля Вялікай Айчыннай вайны ў канцы 1940-х гг. савецкія ўлады прымусілі сясцёр непакалянак пакінуць Глыбокае. Засталася толькі адна манахіня, якая «не хацела пакідаць дэкана Антонія Зянкевіча, які, зрэшты, быў цяжкі хворы. Апякавалася ім аж да ягонай смерці ў 1951 г., пасля чаго яе прымусілі з’ехаць» [2].

У 1933–1947 гг. сёстры непакалянкі працавалі таксама ў Вішневе (Вілейскі павет) ў касцёле св. Тадэуша, драўляны кляштар якіх збудавалі на месцы драўлянага касцёла. З прыходам савецкай улады, у 1947 годзе, кляштар непакалянак быў зачынены, а будынак у хуткім часе згарэў [4]. Яшчэ адна пляцоўка на заходнебеларускіх землях існавала ў Ракаве (Маладзечанскі павет). Пачатак дзейнасці сясцёр непакалянак у гэтым месце адносіцца да 1929 г. Як вынікае з архіўных матэрыялаў, у 1930-х гг. там працавалі 3 законніцы, якія прыбылі з Варшавы. Непакалянкі займаліся дзіцячым прытулкам і адукацыйна-дабрачыннай працай [9, s. 514].

Такім чынам, у першай палове XX ст. пляцоўкі непакалянак на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі ў Слоніме, Глыбокім, Валожыне, Вішневе, Ракаве. Дасягненні супольнасці сясцёр непакалянак на глебе адукацыі сталі важным укладам у пашырэнні адукацыйнай прасторы на тэрыторыі Беларусі.

## Літаратура

1. Герасімчык, В. У. Жаночая семінарыя імя М. Дароўскай у Слоніме (1919–1936) / Герасімчык В. У. // Адукацыя на Віцебшчыне: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 30–31 сакавіка 2010 г. / [рэдкалегія: В. У. Акуневіч (адказны рэдактар) і інш.]. – Віцебск, 2010. – С. 144–147.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Гісторыя Парафіі Святой Тройцы ў Глыбокім. – Рэжым доступу: http://strinitas.com/index.php/parafiya/gistoryya. – Дата доступа: 21.12.2022.

3. Івашчонак, А. Сястра Тадэя Касцюшка / А. Івашчонак // Каталіцкі веснік. – 2011. – № 6. – С. 7.

4. Касьцёл Сьвятога Тадэвуша (Вішнеў). – [Электронны рэсурс]. – https://www.wikiwand.com/be-tarask/Касьцёл_Сьвятога_Тадэвуша_(Вішнеў). – Дата доступа: 22.09.2021.

5. Міхайлік, Л. Жаночыя законныя супольнасці на тэрыторыі Гродзенскай дыяцэзіі ў перыяд 1921–1939 / Л. Міхайлік // Studia Theologica Grodnensia : рэлігійнае выданне : зборнік навуковых артыкулаў. – Гродна, 2007–2011. – № 5. – С. 63–74.

6. Пра пакліканне. Ружанцовыя разважанні. – Камісія па справах Божага культу і дысцыпліны сакрамэнтаў пры КПББ. – Мінск : Про Хрысто, 2005. – 202 с.

7. Ружанцовыя разважанні / на бел. і польск. мовах. – Мінск: Про Хрысто, 2001. – 330 с.

8. Станкевіч, А. З Богам да Беларусі : збор твораў / А. Станкевіч. – Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2008. – 1097 с.

9. Archiwum Akt Nowych w Warszawe. Ministerstwo Wyznan Religijnych i Oswiaty Publicznej. Zakony – sprawy ogolne – wykazy zakonow i informacje o działalnosci nadsyłane przez urzędy wojewodzkie 1922-1938. Sygnatura 906.